программы, разработанные профессионалами. Именно таким образом они смогут соответствовать запросам времени.

**Библиографические ссылки**

1. Галкин Д. В. Современные исследования цифровой культуры // Гуманитарная информатика. 2004. Вып. 1. № 1. С. 40–49.
2. Ерофеев С. В. Интернет-журналистика на рубеже XX–XX I вв. М., 2011.
3. Галкин Д. В. Современные исследования цифровой культуры // Гуманитарная информатика 2004. Вып. 1. № 1. С. 40–49.
4. Михайлова Е. Г. Культура в «цифре»: почему профессионал будущего должен быть немного «айтишником». [Электронный ресурс]. URL: http://news.ifmo.ru/ru/education/trend/news/7234/ (дата обращения: 07.04.2019).
5. Коханова Л. А. Новая специализация в редакции – журналист по работе с сетью // Журналист. Социальные коммуникации. 2017. № 1. С. 63–76.
6. Соловьев А. В. Коммуникативная культура информационного общества // Вестник Московского государственного университета культуры и искусств [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/kommunikativnaya-kultura-informatsionnogo-obschestva (дата обращения: 09.07.2019).

# РЭДЫЗАЙН – НЕ МЭТА, А СРОДАК: АСАБЛІВАСЦІ ВІЗУАЛЬНЫХ ФОРМАЎТВАРАЛЬНЫХ СРОДКАЎ МЭДЫЯКАНТЭНТУ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

***А. І. Кунахавец-Плявака***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*elena_kunahovec@mail.ru*

Разглядаецца рэдызайн як спецыфічны кірунак сучаснага газетнага дызайну. Актуальнасць працы абумоўлена неабходнасцю паляпшэння якасці друкаваных СМІ, у прыватнасці раённых газет. Аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што са з’яўленнем новага тыпу масавага чытача, з пэўным колам інтарэсаў, сваімі патрабаваннямі і перавагамі, супрацоўнікі рэдакцый мясцовых выданняў павінны знаходзіцца ў пошуку не толькі тэм для напісання публікацый, але і спосабаў арыгінальнай падачы матэрыялаў, улічваць усё тое, што робіць газету цікавай і эстэтычна прывабнай. Сёння дызайн раённых газет не заўсёды адпавядае патрабаванням сучаснага чытача. Каб змяніць сітуацыю, услед за вядучымі грамадска-палітычнымі выданнямі рэспублікі яны пачынаюць звяртацца да рэдызайну.

***Ключавыя словы:*** рэдызайн; графічная мадэль; візуальная журналістыка; раённая газета.

# REDESIG – NOT A GOAL BUT A MEANS: FEATURES OF VISUALLY FORMING FLOWSMEDIACONTENT OF REGIONAL NEWSPAPER

***I. Kunahavets-Plevako***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. I. Kunahavets-Plevako (elena_kunahovec@mail.ru)*

The aim of this study is the description of redesign as a specific line of contemporary newspaper design. Relevance of the work due to the need to improve the quality of print media, in particular the regional newspapers. The author focuses on the fact that with the advent of a new type of mass reader with a certain range of interests, their needs and preferences, local media editorial staff must be in search of not only writing for publications, but also ways of original filing materials to take into account all what makes a newspaper interesting and aesthetically appealing. Today, the design of regional newspapers do not always meet the requirements of the modern reader. To change this situation, local newspapers are beginning to resort to a redesign after leading socio-politicalpublications of republic.

***Keywords:*** redesign; graphic model; visual journalism; local newspaper.

Разгортванне раённага друку на Брэстчыне бярэ пачатак у канцы 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Шэраг выданняў паўднёва-заходняга рэгіёна рэспублікі ў бягучым годзе адзначаць сваё васьмідзесяцігодзе. За гэты час некаторыя мясцовыя газеты не раз змянялі сваю назву, узбагачаліся іх жанравая і тэматычная палітры, удасканальвалася афармленне. Разам з тым у адрас мясцовых сродкаў масавай інфармацыі доўгі час гучалі і працягваюць гучаць справядлівыя папрокі ў тым, што большасць з іх затрымалася ў мінулым стагоддзі: «Складваецца ўражанне кадравага застою, нежадання бачыць і ўспрымаць відавочны факт: сёння ва ўмовах жорсткай інфармацыйнай канкурэнцыі працаваць толькі на старым багажыў жо не атрымаецца» [1]. Час не стаіць на месцы: змяняюцца людзі, змяняецца структура спажывання медыяпрадуктаў. Учарашнія «проста чытачы» сёння могуць самі ствараць навіны і распаўсюджваць іх па разнастайных інфармацыйных каналах.

Сучасныя газеты як крыніцы інфармацыі на папяровым носьбіце павінны стаць значна больш прывабнымі і цікавымі, дэманстраваць павышаны ўзровень візуальнай інфармацыі. Менавіта дызайн (пасля якаснага кантэнту), па меркаванні даследчыкаў, з’яўляецца самым значным

элементам пасняховага друкаванага выдання. Адзін з заснавальнікаў канцэпцыі візуальнай журналістыкі Роберт Локвуд акцэнтуе ўвагу на тым, што «газеты перасталі чытаць не таму, што іх кантэнт больш не задавальняе запыты сучаснага чалавека, а таму, што яны занадта складана напісаныя… Дызайн, які з павагай ставіцца да чытацкага часу, павінен валодаць трыма характарыстыкамі: структурыраваць інфармацыю, выкарыстоўваць візуальныя маркеры для прыцягнення ўвагі да зместу, раскрываць сутнасць навін адначасова некалькімі шляхамі» [2, с. 112–114]. Сапраўды, няўдалы дызайн пагаршае ўспрыманне любога, нават самага добра напісаннага матэрыялу. Пасняховае ж афармленне газетных палос садзейнічае поўнаму выяўленню кантэнту надрукаваных матэрыялаў, палягчае ўспрыняцце інфармацыі, дапамагае чытачу арыентавацца ў змесце нумара, знаходзіць на газетных старонках найбольш значнае, актуальнае і цікавае для яго. Са стылем жыцця медыяспажыўцоў змяняецца і іх здольнасць успрымаць інфармацыю. Форма падачы матэрыялаў у такім выглядзе, якой яна была на старонках раённай газеты дзесяць гадоў таму, сёння будзе выглядаць не вельмі эфектыўна. Менавіта таму адным з самых актуальных напрамкаў развіцця сучаснага газетнага дызайну становіцца рэдызайн (літаральна «змена дызайну»), галоўнай мэтай якога з'яўляецца ўдасканаленне графічнай мадэлі СМІ для палягчэння разумення яго зместу. Услед за вядучымі градамска-палітычнымі выданнямі рэспублікі да рэдызайну пачынаюць звяртацца і мясцовыя выданні Брэстчыны.

Як паказвае практыка, у цэлым для супрацоўнікаў беларускіх рэгіянальных выданняў характэрна вузкае разуменне тэрміна рэдызайн: ён успрымаецца асобна ад зместу, маркетынгу і менеджменту газеты. Такі падыход, на наш погляд, з'яўляецца непрадуктыўным, пярэчыць самой сутнасці гэтага працэсу. У навуковай літаратуры паняцце рэдызайн вызначаецца менавіта як «даследаванне працэсу выпуску газеты і прынцыпаў фарміравання зместу, а таксама арганізацыі рэдакцыі і дызайну», комплексная рэканструкцыя, калі ўсе ступені вытворчасці газеты накіраваны на дасягненне адных і тых жа мэт і працуюць разам [3, с. 54].

Пры правядзенні рэдызайну нельга не ўлічваць кантэнт выдання: змястоўная мадэль з'яўляецца асноўнай і падпарадкоўвае сабе афарміцельскую. Мадэрнізацыя прадугледжвае змяненне не толькі тэматычнага рубрыкатара, але і прынцыпаў фарміравання кантэнту, у прыватнасці, маецца на ўвазе выкарыстанне ў працэсе распрацоўкі тэмы розных спосабаў прэзентацыі, у тым ліку і візуальных. Пры гэ-

тым сам працэс рэдызайну неабходна пачынаць не толькі з аналізу зместу выдання, але і яго аўдыторыі. Падыходы, якія добра працуюць у адной газеце, не абавязкова будуць настолькі ж эфектыўнымі ў іншым выпадку. Як паказвае практыка, рэзкія змены ў афамленні друкаваных выданняў заўсёды выклікаюць абурэнне з боку іх пастаянных чытачоў. Разам з тым, прытрымліваючыся прынцыпаў графічнага кансерватызму, можна застацца па-за ўвагай патэнцыйнай аўдыторыі СМІ, таму ўсё ж такі трэба імкнуцца да пошуку балансу інтарэсаў. Тым больш сучасныя камп'ютарныя магчымасці дазваляюць ператварыць рэдызайн у перманентную з'яву, галоўнае, каб працэс удасканалення не пераўтварыўся ў бяздумнае ўпрыгожвальніцтва і тэхнаманію.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Многие районные газеты в Беларуси застряли в прошлом веке [Электронный ресурс]. URL: https://www.sb.by/articles/mnogie-rayonnye-gazety-v-belarusi-zastryali-v-proshlom-veke-o-proleskovskiy.html (дата обращения: 30.08.2019).
2. Lockwood R. News by Design: A Survival Guide for Newspapers. Denver, CO : Quark Press, 1992. 145 p.
3. Дизайн периодических изданий : учеб. пособие для студентов фак. и отд. журналистики ун-тов / под ред. Э. А. Лазаревич. 2-е изд. М.: Изд-во МГУ, 2004. 120 с.

## ФОТОЖУРНАЛИСТИКА В ЦИФРОВОЙ МЕДИАСРЕДЕ: ОСОБЕННОСТИ ТРАНСФОРМАЦИИ

***Ли Исянь[1], С. В. Харитонова[2]***

*[1]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
652673029@qq.com,*

*[2]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
kharytonavasv@bsu.by*

Цель исследования состоит в выявлении особенностей трансформации профессии фотожурналиста в новой цифровой медиасреде. Авторами определяется специфика влияния интернета на современную фотожурналистику в условиях дигитализации общества. Формулируются рекомендации по совершенствованию деятельности фотожурналистов и повышению качества фотоматериалов на современном этапе. Научная новизна исследования